Анатоль Бярозка
Anatol Biarozka

Адзінаццаць вершаў
Eleven Poems



Выдаў: Мацьвей Рэпкаў-Смаршчок
Мантысэлля у Мінэсоце, ЗДА, 1989.

published
by matthew b. smorstok
under sponsorship
of the

BYELORUSSIAN INSTITUTE
OF ARTS AND SCIENCES
IN THE U.S.A.

MONTICELLO, MN. 1989.

Notes for the English-speaking reader about the author, his land and his writing.

Anatol Biarozka was a young Byelorussian poet whose short-lived burst of creativity came to an abrupt end among the cataclysmic events that engulfed Europe in the early 1940's. He disappeared from the literary scene, and this is a first attempt in nearly half a century to collect some of his writings.

His land is Byelorussia (Whiteruthenia), situated between Poland and Russia — a country that remains little known outside its own borders, although it became one of the founding members of the United Nations. Though a vast and mighty state during the Middle Ages, known at that time as the Grand Duchy of Lithuania, it succumbed to conquests by its aggressive and greedy neighbors, and was "crucified at the crossroads of East and West". Presently it survives only as Byelorussian Soviet Socialist Republic, one of the constituent republics of the Soviet Union, where it is engaged in an arduous struggle to preserve its culture, its language and its very identity.

This hapless nation owes its survival to the proud and resilient Byelorussian peasant, who, though downtrodden and oppressed by his merciless enemies from East and West, and abandoned by his own renegade nobility and clergy, never submitted to enslavement; his indomitable spirit erupted time and again in new and powerful renaissance of the whole people — people that never abdicated their right "to be called human".

To understand Byelorussian literature fully the reader must be aware of the allegory and symbolism that often permeates most of these writings. This could not be avoided in the atmosphere of suppression where they were written. There existed a need to disguise the true message — even a simple message of love for one's country and people — in order to evade the malicious censorship of the hostile government in power — whether Russian or Polish. Often it was necessary for the writer to encode the message so that only his compatriots, or people friendly to his cause, could fully understand its meaning; if he failed, and the message became too obvious — the consequences could be cruel, even fatal, as repression came swiftly and ruthlessly.

LEITMOTIF

(from J. Pusca)

O thou, my village . . . Gold and blood of September . . .
Why are the strings of my cymbaly sounding in sad exultation?
Do they desire to scatter the woes of the past that fell
into my heart as a bitter herb?

I drank a full measure of sorrow in the shadow of these
rustic dwellings. Their charms smiled at me only when sunshine
was streaming through linden trees.

Laughter was unknown to my lips. Sometimes it would merely
pass by me with a faint whisper when I was leading my
horse from the night pasture.

Alas, my golden strings, sow the sounds of sorrow.
They will not germinate in the new spring. Thus the last musician
is crying beside the broken fences of peasant settlements.

'вядучы матыў.
/пазыка ад 'я.'пушчы./

'эх, вёска...
верасьнёвая прозалаць-крой...
'ну, чагож так зайшліся цымбалы?
'ці ня высеяць хочуць мінулага боль
палыном што у сэрца запала?

'яе выпіў я поўную чару
ў застаронку сялянскіх сяліб.
'мне тады усьміхаліся чары
калі сонца цадзілася з ліп.

'мае вусны ня ведалі сьмеху;
ён у прочках блукаў бязь мяне.
'бывала, як едзеш з начлегу
ён шопатам ціхім каня абміне.

'дык мае залатыя цымбалы —
высявайце балючыя зыкі!
'ня ўзыйсьці ім у новую весну.
'гэтак грае апошні музыка
ля вясковых паломаных весьніц.

1925.

TO THOSE IN THE LEAD

A greeting to you from fields — the wide fields that are swaying in the wind with waves of grain, when the early morning sunshine lights the pearly sparks of dew in the blue eyes of field flowers; when the meadowlark fills the heights of the skies with his morning hymn, and the forest sings with the rustling of leaves.

And a greeting to you from the gray, sagging peasant huts, that have seen no light for centuries. Ill fate is their sister, and hunger is their brother. Onto their faces centuries have carved a cross of blood and suffering. A greeting to you from the sagging peasant huts.

And a laboring greeting to you from the silent hearts, from the hearts that hardened in the struggle: Now there will be no slavish sigh forthcoming from their depths. They steeled themselves into a proud silence. Though their trail is callous and strewn with misfortune, they are sending you their brotherly greeting.

'Перадавым.

'Ад палёў вам прывет, ад шырокіх палёў
што калосяцца хваляй зярністаю
калі золак у сініх вачох васількоў
пэрлы росаў запаліць іскрыстыя,
вышы неба жаўрук гімнам раньня зальле,
лісьця шопатам бор запяе.

'І прывет вам ад шэрых, пахіленых хат —
хат, што сонца спрадвеку ня бачылі:
ім нядоля – сястрыца, і голад ім-брат,
а вякі на іх твары назначылі
крыжам мукі крывава правораны сьлед.
'Ад пахіленых хат вам прывет!

'І працоўны прывет вам ад сэрцаў цямных,
ад грудзёў, што ў баёх ўзгартаваліся:
ўжо з іх нетраў ня выйдзе нявольніцкі ўздых;
яны ў гордую ціш закаваліся.
'Хоць мазольны і горам услані іх пуць,
вам свой братні прывет яны шлюць.

You meet me, my fields, with wide spaces;
hug me and lull me gently to sleep — lest the dark thoughts
hover over my head like ravens, lest they frighten me;
may the evening wind catch them and carry them into the far
meadows; may the shadows scatter them through the thickets
of forests. Let my native grain field open its proud soul
before me — the soul that was plowed with deep suffering,
the soul that is painfully silent.

Let the unfathomed sounds gather and let them be veiled in
silent thoughtfulness until the night pulls its dark curtain over
the village and over the ancient burial mounds of old.

Perhaps I'll dream about a mighty temptest that will arise over
the fields and shatter the black darkness; that from under the
peasant cloaks a stormy song will arise under the homemade
sandals, under the bare feet of poverty, and that the fields
will greet me with sheaves, with clang of steel,
and with rows of harvested grain.

'ты сустрэнь мяне, о поле, шыр-прасторамі,
прыгарні ды ўскалышы.. каб думы цёмныя
вараньнём над галавою ня кружыліся,
не палохалі... 'няхай вецер вячэрні
іх падхопіць і нясе у далі,
на лугі... 'хай па гушчах лесу
іх пагубяць, расьцярушаць суценьні...
'няхай душу гордую разгорне
ніва родная перада мною —
душу, ўзрытую мукамі, цярпеньнем —
а маўклівую, маўклівую да болі!
'няхай водгаласы склічуцца бяздомныя
і спаўюцца хай задумаю нямою
аж пакуль на вёску, на курганьне
чорную накіне ноч завесу...

'мо' сасьніцца мне, што з поля віхры ўзьбіліся,
цемру чорную раскалыхалі —
з пад сярмягаў можа бурна ўстане
песьня — расхвалюецца разорамі
пад лапцямі, пад нагамі босымі —
і яшчэ раз прывітае мяне поле
каласамі, сталі звонам і пракосамі.

A NIGHT NEAR A DOG HOUSE

A dirty-faced moon crawled out on the muddy sky and spit on the clouds disgustedly with its anemic yellow light. The moon is full tonight. Tonight the moon is ruling tyrannically over the skies. The moon is trampling on the stars — round, yellow and arrogantly proud.

A heavy boot will never strike the moon in its teeth. The moon does not know about a dog's life — and there are two kinds of dog's life: either to drag around a heavy chain and a collar, or to walk smartly on the hind legs before a master.

And the dog would wish to sink his canine teeth into the cold body of the moon; let the moon not laugh over the bloodied snout of the dog — at least not until the blood is clotted and a crust forms over the wounds.

But the moon is high and unreachable. He, whose neck is bent down by a heavy chain and a heavy boot, cannot attempt to defeat it. And the dog will not arise, he will not bare his teeth. He only will painfully howl.

'ноч каля буды.

'умурзаны месяц выпаўз на мутнае неба,
плюнуў з агідай на хмары анэмічным,
жоўтым сьвятлом.
'сёньня месяц у поўні, 'ён сёньня на небе тыраном
самаўладным... 'ён зоры топча – круглы, жоўты
і горды.

'месяцу ў зубы цяжкі бот ня выне;
пра долю сабачую
месяц ня ведае. 'бо дзьве сабачыя долі:
або валачыць ланцуг ды аброжу,
або лоўка прад панам
хадзіці на задніх лапах ...
і хацеў-бы сабака
ўпіцца зубамі ў халоднае месяца цела:
хай не сьмяецца з сабачай яго
закрываўленай морды
хоць пакуль запячэцца кроў
а на ранах струпы закарэюць.

'але месяц высока. 'не таму яго дабываці
каму цяжкі ланцуг ды цяжкі бот
долу сагнулі шыю.
'і ён не сарвецца, ня блісьне клыкамі...
ён толькі балюча завые.

With a thousand flaming eyes, burning in the darkness of night, the sky is watching the earth and the starry sparks are falling onto heavy folds of the deep-plowed soil. And the menacing shadows are settling darkly and heavily on the freshly upturned black furrows.

The night is gently whispering with the winds. Beyond the wide-plowed fields — gray huts and their thatched roofs fell asleep in weariness. The sky is watching them with its starry eyes. The night is whispering with the winds, so gently. The sleepy straw roofs of the huts are not answering them; neither are the hardened hands of the people. Heavy are the calluses of those hands — as heavy as furrows of the plowed fields. Their lot is dark, as the dark bread they earn. The chains of many centuries harnessed the giants strength into a yoke of submission.

The sky is watching the plowed fields with a thousand fiery stars. It watches the silent huts, the hardened hands and their dark, heavy bread. The gray huts and the heavy hands are silent and menacing. Only a powerful pain knows how to be that silent.

'Тысячай воч палымяных, разпалёных цемрай начною,
неба ўпілося ў зямлю; і на цяжкія скібы ральлі
зорныя блескі упалі; і плоймай зладвесна-нямою
чорна у чорных барознах цені ліхія ляглі.

'Ноч шапталася зь ветрам — 'за полем шырока ўзгараным
шэрыя хаты, бедныя стрэхі ў зьнямозе паснулі;
ў стрэхі неба ўпілося зьзяньнем зор палымяных...
'Ноч шапталася зь ветрам — 'так ціха... 'ня чулі
сонныя стрэхі пахілых хат, закарэлыя рукі;
бо цяжкі мазоль тых рук, як цяжкія скібы ральлі;
чорная доля, як чорны хлеб... 'у ёрмы прынукі
доўгіх вякоў ланцугі волатаў моц упраглі.

'Тысячай воч палымяных неба упілося ў барозны,
ў ціхія хаты... ў жорсткія рукі... ў чорны іх хлеб і ў соль.
'Шэрыя хаты, цьвёрдыя рукі — маўклівы і грозны:
гэтак ціха маўчаць умее толькі магутны боль.

ONE DEATH

Tonight you brushed past me ever so near;
over the rags in the gray twilight — white, silent and
ominous breathed the sepulchral chill.

And she — her sixteen early springs were gazing from her eyes
and youth was bursting from her lips with vivid blood,
and her breasts were ripening firmly like apples.

All through the night you were hovering over her silently,
chilling all hopes with your breath. I knew that you are
all-powerful. Before you blossoms wither and your name
is as white as silence itself.

Her mother bent over her and hid her face in her hands.
She was silent. Silently from among the rough fingers
rolled a clear spark.

"Mother, why are you crying?"

Her mother shuddered. Suddenly, in the glow of a smoky
lamp the face was revealed, deeply wrinkled and yellow.

"My child, I am not crying . . . Not crying . . ."

Perhaps she believed her; again she opened her eyes —
and from her eyes the sixteen early springs were gazing
and the will to live — petrified in helplessness.

The morning light was filtering through the window and
burning the death watch candles on the glass.

And from the church tower tolled a bell — gravely, mournfully.

'адна сьмерць.

'сягоньня ты гэтак блізка прайшла...
'па лахмоцьці у мораку шэрым
бела, ціха і грозна
магільны павеяў холад.

'а ёй шаснаццаць веснаў із вачэй глядзела;
ад вуснаў маладасьць лунала кроўю
і сьпелі яблыкамі грудзі пругкія.

'ўсю ноч над ёю вісла ты нячуіна –
надзею ледзяніла подыхам;
я ведаў: ты магутная;
перад табою долу гнецца цьвет
і белае імя твае як ціш.

'яе маці схілілася – і ўгуліўшы ў далоні твар
маўчала. 'нема з паміж пальцаў каравых
скацілася чыстая іскра.
„'мама, чаму ты плачаш?"

'ўстрапянулася маці. 'ў ірдзеньні дымнае лямпы
твар адкрыўся, глыбока збаразьнены, жоўты...
„'я, дзетка, ня плачу... ня плачу..."

'што-ж... 'мо' паверыла. 'ўзноў адчыніла вочы:
з вачэй яе шаснаццаць веснаў глянула
і воля жыць – ў бязсільлі скамянелая.

'ў акно цадзілася заранньняе сьвятло
на шыбах палячы іскрыстыя граніцы.
'а на званьніцы
ударыў звон.
'глухі. 'хаўтурны.

CREDO IN DUOS DEOS

Today I'll submerge my thoughts in untamed whiteness.
May the young springtime erupt in a tide, may it run
over the rim, may the tempestuous white apple blossoms
be strewn on the green of May.

Hear. The cool breast of the earth, saturated with sweat of
generations of serfs, too long was spilling the hot redness
of blood on the whiteness of blossoms. The peasant huts,
imbedded in the black dirt, stiffened in pain, are bursting
with desires and hopes of centuries, and they are promising
to gather a harvest where the bones of my ancestors
are decaying under the mosses.

I bow my head before the God of my ancestors.

And when the apple blossoms whisper through the spring
of my martyred land and sprinkle their whiteness over the green
of May branches, when the wind is blowing stiffly in my face,
then the old wounds are re-opening, then the songs are
awakening about power and anger, and hands are prepared
to open the coming day with hardened steel.

I am praying for such a day to the god of my progeny.

credo in quos deos

'сёньня думы свае пагаплю ў непакорнай у белі.
'хай запеніцца хмельна, пацячэ пераз край,
пырсьне бурнаю бельлю васна маладая
яблынь цьветам на зялёны на май.

'чуй. 'сырыя грудзі зямлі, напоены потам мужычым,
доўга кроў - гарачую чырвань - цадзілі у росьцьвіту бель;
хаты, ўрослыя ў чорную гразь, закарэлыя ў болі
векавою тугою набраклі ды сабраці суляць жыво
там дзе косьці нямыя бацькоў парахнеюць пад мохам.

'перад богам маіх бацькоў голаў схіляю долу.

'а калі над вясною замучанай зашапоча яблыні цьвет—
на галіны, на май ацярушыцца бельлю;
калі ветрам у твар запахне - тады ятрацца раны,
тады будзяцца песьні пра сілу і гнеў, а рукі гатовы
заўтрашні дзень адчыніць сабе стальлю.

'я малюся за гэтакі дзень богу маіх патомкаў.

1939.

Fields — far and wide — and the sky above them, blue and unfathomed. The evening whisper of fields, a mellow song from a pain-filled breast, a song that strives forth with a gust of wind on the sounds of night. And the unharvested fields are listening . . . This is a song that stirs the blood into flames. This is a song about liberty.

There the graves of my fathers are sleeping under the sagging ancient crosses. The heritage of past centuries overgrown with grass. Like black wounds, the long shadows of the crosses carve themselves into the gray earth, fall onto the yellow sand and cover the grass with black sadness.

Here on these burial mounds, the alien gods and tsars for centuries were clashing over their spoils of war; and their blood-stained altars were steaming with blood of our hearts.

Beyond the fields — the huts of a village. Green moss is hanging from their thatched roofs, and the roofs are overhanging the huts. The fires of the setting sun are glowing red on their window panes. Shadows are spreading over the land, slavishly crawling on the ground. Like cold steel the breast of the earth is cold. A wind from my native fields — perhaps it will scatter my sadness?

The huts — poverty stricken, dull and obscure; under your somnolent roofs lies my heart; it lives with your destiny, it saddens with your pain. The evening is spinning its century-long dreams under the thatched roofs.

And the evening, the heart, the graves and the land have melted into a single paean — Kryvia, my motherland . . .

And the deep plow-tracks are worshipping the sun — the sun that is extinguishing itself among the gray ashes of the darkening clouds.

'поле, далёка - шырока поле ... і неба над полем
сіняе... 'неба бяздоннае...'шолах вячэрні палёў
ціхі, як песьня з грудзей набалелых, што з ветру
парывам
па струнах вечару ймкне ...'і слухаюць нівы ...
'гэта песьня што полымем пеніць кроў —
гэта песьня аб волі!

'там - магілы дзядоў пад крыжамі пахілымі дрэмлюць -
зьдзірванелая спадчына сівых вякоў; як чорныя раны
ўеліся доўгія цені крыжоў у шэрую землю,
ўпалі на жоўць пяску, ўкрылі траву пад сабою
чорным сумам ...

'гэтта, на гэтых курганах
вякамі здабычу дзялілі чужыя багі а цары
і крывавыя іх аўтары
дыміліся доўга - нашай крывёю.

'за полем хаты. 'на стрэхах мох абвіс зялёны;
зьвісьлі стрэхі над хатамі. 'неба вячэрні пажар
палымее на шыбах чырваньню. 'сьцелешча цень па загонах
рабска паўзе па зямлі ... 'мой халодная сталь
грудзі зямлі халодны... 'вецер ад родных хат —
разьвее мо' гора?

'хаты - бедныя, цёмныя... 'пад вашымі стрэхамі соннымі
сэрца маё вашай доляй жыве, вашым болем сумуе...
'вечар пад стрэхамі сьніць сваю думу-тугу векавую...
'з думай-песьняй ад хатаў шырока-разгоннаю
вечар, сэрца, магілы і поле зьліліся ў адзіны псальм -
'Крывія!
'і моляцца сонцу разоры —
сонцу, што ўжо дагарае на шэрым попеле хмар.

THE CRANES ARE FLYING

*The sun of September is playing on their wings,
and faintly, sadly the wings are strumming the winds
above the empty harvested fields, above the forest.*

*Their untamed call carries far into the blue of their boundless
routes. Left behind somewhere in the faraway space is the
home of their birth and the faithful heart.*

*They are flying — away. And below, with a silent prayer,
the fields are falling asleep in solitude. And their wings,
immersed in blue, are painted gold by September sunshine . . .*

адлёт жураўлёў

'верасьнёвае сонца гуляе
на іх крыльлях - і ціха, тужліва
крыльлі йграюць у ветры моў струн пералівы
над іржышчам пустым, над гаем .

'вольны покліч далёка нясецца
ў паднябесных сініх шляхох ...
там, далёка дзесь, родны астаўся парог-
асталося вернае сэрца .

'і лятуць . 'а пад імі, зь нямою малітваю,
засынаюць палі ў адзіноце ...
'а іх крыльлі, сіньню залітыя,
верасьнёвае сонца залоціць .

The evening is silent again as it was the last time.
But tonight there is no light in your window.
Just as the last time, the night sky is deep; just as the last time,
the waters are sparkling; and unchanged, waves are kissing
the sand and the willows are leaning over the silent Vilia river.
Just as the last time, the wind is whispering in the reeds
and the willows, and the stars are shining — tonight, as before.
Among the scattering of windows only one was
extinguished tonight . . .

Then why is it that my heart is crushed by infinite loneliness?
And why is it that a heavy burden fell on my chest
with painful reproaches?
From a faraway forest — dark and mysterious — I hear a faint,
distant song. Is it a song of happiness and good fortune?
Or is my flower of midsummer night just blooming and wilting?
Tonight, there is no light in your window. With it the one
spark that was warming me vanished in darkness tonight.
The wind is kissing the willows; the reeds are whispering
over the water. Among the vast scattering of city lights
only one was extinguished tonight. Only one.

'сягоньня патухла тваё акно...
'ціхі вечар ізноў, як учора;
але сёньня патухла тваё акно...

'гэтак сама неба начное глыбока,
гэтак сама іскрацца воды ў месячным зьзяньні
і нязьменна хвалі цалуюць пясок
і хіляцца вербы над ціхай 'вяльлёю;
гэтак сама вецер шасьціць ў аерах ды лозах
і сьвецяцца зоры — сягоньня, як учора.

'сярод россыпі вокан
патухла толькі адно.

'дык чаму ж зашчаміла мне сэрца журба
адзіноты бяздоньнем
ды чаму на грудзёх цяжкі камень улёгся
з балючым дакорам?

'ад далёкага лесу — ад цёмнага бору
песьня чуецца дзесьці далёка-далёка...
'а ці песьня аб шчасьці і долі?
'а мо' папараць-кветка мая расьцьвітае ды вяне?

'ў гэты вечар патухла тваё акно;
зь ім яшчэ адна кволая іскра што грэла мяне
датлела ў цемры сягоньня...

'вецер вербы цалуе; аеры шумяць над вадою...

'сярод россыпі вокан
патухла адно...

A LETTER TO MY MOTHER

(Translation From the Forgotten)

As the autumn days are waning, I long for you in my thoughts,
and thoughts know no confines.

You are far away among strangers in your god-forsaken
impoverished village, where autumn is painting the maples gold,
and the morning fog blankets the meadows and fields.

You are spinning your coarse thread of flax, summoning
the memories of the days and events when you drank
your bitter cup of adversities.

And perhaps you mourn that your son will never
return from his distant travels.

And I, I am here in a strange far-off city amidst the vain
hustle of another empty day, alone and silent.
I stand and breathe the winter winds, and as I gaze at the
leaves that perish under my window, I truly believe that
my smile will be carried to you on the clouds.

Ліст да маці.

/перакдад з забытага/

На схіле восені дзён
к табе імкнуся у думах —
а думы ня знаюць запынаў.
Хочаш — абое ў сутоньні вячэрнім
ў вусьмешку твар
як у бэзу рукі
ахінем ...

Ты там, у вёсцы маёй убогай
дзе восень залоціць кляны
а ўраньні туман
засьцілае лугі ды папары;
Ты прадзеш сваё горкае зрэб'е,
ўспамінаеш падзеі а дні
калі выпіла горычы чару —
і мо плачаш. Ня вернецца сын
з далёкай дарогі ...

А я тут, у месьце чужым і далёкім
пад хмарным восені небам
ў мітусьні парожняга дня
ды зьнясільлі дарэмных узьлётаў —
адзін, бязмоўна стаю
а ўдыхаю павевы зімы
і гляджу на лісьцё што пад вокнамі гіне
і веру
што вусьмешку маю
данясуць табе хмары.

EPILOGUE

"Do the bitter thoughts about your native land
haunt you? — The land now ruthlessly subdued by the enemy,
now in the hands of a fiend? I know — those are dreams about
*the linden trees in bloom on an early morning of summer."**

My trail, arduous and stained with my own blood,
never led me to happiness. A deep, gnawing fear is hiding
in my heart — that I'll vanish without even leaving my
footprints behind me.

I am cursing my bitter, cruel fate, and I am tugging
at the burden, straining with all my might in helpless
impotence and weariness. Do my lonely trails lead me
to an unmarked, forgotten grave?

*"Excelsior"

эпілёг

„'а ці думы горкія прыйшлі
аб краіне, ворагам забранай?
'знаю - сьніцца расьцьвітаньне ліп
у ружовы летні ранак." *

'абяздолены мой строны шлях
аніколі не давёў мяне да шчасьця -
і трывога тоіцца ў грудзях
каб бясьсьледна не прапасьці.

'і кляну я горкі лёс ліхі
і напружваю ў зьнямозе сілы...
'ціж вядуць мае самотныя шляхі
да забытае, бязкрыжае магілы?

* „узвышша"

Выдана з дапамогаю
Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва
у Задзіночаных Дзяржавах Амэрыкі

Друкарня Monticello Printing, Inc.

Printed by Monticello Printing, Inc.